жр 3214 07/210

СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

ПРАЧЫТАЎ—ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

# ГОМЕЛЬСКАЯ ПРАЎДА

Орган Гомельскага Абкома і ГК КП(б)Б

№ 19, 30 ЖНІЎНЯ 1943 года

**На бой, таварышы партызаны і партызанкі! На рашучы і бязлітасны бой з заклятым ворагам! Дапамагайце ўсімі сіламі Чырвонай Арміі--у гэтым залог хуткага вызвалення нашай зямлі ад крывавых нямецкіх акупантаў!**

Бібліятэка АН БССР

## НІ АДНАГО ФУНТА ХЛЕБА НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

Нямецкім захопнікам не ўдалося пакарыць беларускі народ. Праваліліся ўсе іх планы падавіць узброенай сілай разгарнуўшыйся ва ўсіх раёнах Беларусі народны партызанскі рух. Барацьба становіцца ўсё больш жорсткай і бязлітаснай.

Зараз немцы ідуць на новыя зладзействы. Яны хочуць канчаткова разарыць і аграбіць беларускі народ, забраць у сялян хлеб гэтага года і тым самым паставіць насельніцтва пад пагрозу галоднай смерці. Барацьба за хлеб у такіх умовах становіцца неабходнасцю жыцця для ўсіх і справай усенароднай.

Наша агульная задача і партызан і ўсяго насельніцтва--сарваць планы і разлікі нямецкіх захопнікаў на беларускі хлеб.

Партызаны павінны ўсімі сіламі дапамагаць і садзейнічаць сялянам ва ўборцы ўраджая. Зжаты хлеб неабходна як можна хутчэй абмалаціць і надзейна захаваць, каб ён не дастаўся ворагу. Бязлітасна знішчаць каманды нямецкіх загатаўцеляў і работнікаў нямецкіх валасных упраў, нападаць на нямецкія абозы з хлебам, знішчаць транспарт і ахову абозаў, а хлеб звяртаць сялянам.

Нарыхтоўку хлеба для партызан праводзіць без якога-б то ні было прымусу. Кожны селянін павінен ведаць, што дапамагаючы партызанам, ён тым самым выконвае свой абавязак перад Радзімай. Размер гэтай дапамогі невялікі--усяго некалькі пудоў у год з гаспадаркі--па сіле кожнаму двару.

Неадкладная задача кожнага партызанскага атрада, кожнага партызана і партызанкі, усіх сумленных сялян і сялянак аказваць дапамогу сіратам, удовам, сем'ям чырвонаармейцаў. Асаблівыя клопаты павінны быць праяўлены да сірат, бацькі якіх загінулі ад нямецкіх бандытаў.

Прамы і святы абавязак камандвання партызанскіх атрадаў, брыгад сачыць за тым, каб ні адзін партызан і партызанка не нарушалі хаця-б ў малейшай меры большавіцкія прынцыпы ўзаемаадносін партызан з насельніцтвам. Усякае свавольства ці адміністрыраванне ў адносінах нашага народа павінна карацца бязлітасна, як за самае цяжкае злачынства перад Радзімай.

Вядучы бязлітасную барацьбу супроць нямецкіх акупантаў за незалежнасць сваёй Радзімы, партызаны змагаюцца з ворагам у першую чаргу за наш народ, за яго жыццё і незалежнасць, за яго свабоду. Інтарэсы партызан і ўсяго беларускага народа—агульныя інтарэсы. У гэтым заключаецца жыццёвасць і непераможнасць партызанскага руху ў нашай краіне.

## Ад Совецкага Інформбюро

### (З АПЕРЗВОДАК З 27 ПА 30 ЖНІЎНЯ)

Нашы войскі, наступаючыя паўднёвей і заходней Харкава, перамагаючы супраціўленне і контратакі праціўніка, прасунуліся ўперад ад 11 да 20 клм., занялі звыш 50 насялённых пунктаў, у тым ліку гор. і чыгуначны вузел ЛЮБОЦІН. Райцэнтр КАЦЕЛЬВА, які пераходзіў некалькі разоў з рук у рукі, зноў занят нашымі войскамі.

У раёне паўднёвей Бранска нашы войскі прадаўжалі наступленне і прасунуліся ўперад ад 12 да 23 клм. Занята звыш 110 насялённых пунктаў, у тым ліку гор. СЕЎСК. У баях за горад знішчана больш 5.000 нямецкіх салдат і афіцэраў, 21 танк праціўніка, 105 гармат рознага калібра, 20 мінамётных батарэй, 420 аўтамашын і павозак з грузам, 2 чыгуначных эшалоны з боепрыпасамі і гаручым. Нашы войскі захапілі наступныя трафеі: 11 танкаў, 74 гарматы, 46 мінамётаў, 263 кулямёты, звыш 1.000 аўтаматаў і вінтовак, 7 радыёстанцый і 14 розных складаў. Узята ў палон 700 салдат і афіцэраў.

У Данбасе, паўднёва-заходней Варашылаўграда, нашы войскі вялі пасяховыя баявыя дзеянні.

За апошнія тры дні на ўсіх франтах падбіта і знішчана 263 нямецкіх танкі. У паветраных баях і агнём зянітнай артылерыі збіта 218 самалётаў праціўніка.

У Баранцавым, Чорным і Азоўскім марах совецкай авіяцыяй патоплена 3 транспарты праціўніка водазмяшчэннем у 15.000 тон, вартавы карабль, 2 кацеры, буксір і баржа.

## Дзеянні совецкай авіяцыі

У ноч на 28 жніўня совецкая авіяцыя зрабіла налёт на чыгуначныя вузлы: Палтава, Валнаваха і Рослаўль. Прамымі пападаннямі бомб разбіта некалькі воінскіх эшалонаў праціўніка з боепрыпасамі, гаручым і тэхнікай. У гэту ноч наша авіяцыя бамбардыравала некалькі аэрадромаў праціўніка.

жр 3214



# НЯШЧАДНЫМ УДАРАМ ПА ВОРАГУ АДКАЖАМ НА ЗАКЛІК ВОІНАЎ-БЕЛАРУСАЎ!

## Свята выконваем наказ правадыра

Існаванне атрада імені Кірава вылічваецца трыма з паловай месяцамі. Але за гэты невялікі час атрад нанёс ворагу цяжкія ўдары. У баявы рахунак атрада ўпісана 18 пушчаных пад адкос варожых эшалонаў; больш 200 вагонаў і платформ з жывой сілай, боепрыпасамі, танкамі і аўтамашынамі знішчаны на шляху да фронта; каля 9 клм. чыгункі і 5 клм. сувязі выведзена намі з строя.

У сваіх радах мы маем баявых, напрактыкаваных майстраў-дыверсантаў. Вячэслаў К. падарваў 11 эшалонаў. Андрэй З., Анатолій С., Владзімір А. і Барыс Б. удзельнічалі ў падрыве ад 8 да 13 эшалонаў кожны.

Пылкая любоў да Радзімы і жгучая нянавісць да ворага— такія баявыя рысы нашых байцоў. Аўтаматчыкі Канстанцін С., Міхаіл Ж., кулямётчык Іван Д. паказалі сябе гарачымі патрыётамі бацькаўшчыны. У адной схватцы з ворагам з атрыманых ран у іх сачылася кроў, але яны не пакінулі свайго месца ў баю.

Непахісна трымаліся байцы атрада ў баю з адной карнай экспедыцыяй. Кіраўцы сумесна з чапаеўцамі знішчылі тады 123-х немцаў—эсэсаўцаў.

Наш удар па ворагу з тыла будзе мацнець. Мы свята выконваем наказ партызанам і партызанкам, дадзены вялікім Сталіным.

ВІКТАР Ш.

камандзір атрада.

## Поспехі дыверсантаў

Выдатных поспехаў дабіліся дыверсанты брыгады, якой камандуе тав. Макар А. Толькі за 5 дзён яны падарвалі 8 эшалонаў. Пры крушэннях разбіта 7 паравозаў, 64 вагоны з ваенным снараджэннем і 9 платформ з тэхнікай.

М.

***

Ноччу наша падраздзяленне авалодала ўчасткам чыгункі. Падрыўнікі начале з Нікалаем Г. і Канстанцінам Р. хутка расставілі міны. Моцнай кананадай прагрымела мноства выбухаў. 923 метры важнай чыгуначнай магістралі былі прыведзены ў нягоднасць.

ІВАН. Е.

атрад імені Чапаева

***

За жнівень месяц групы падрыўнікоў атрада імені Чапаева зрабілі крушэнне 9 нямецкіх эшалонаў і парвалі 208 рэльсаў.

НІКАЛАЙ С.

## Разграмілі варожы гарнізон

У сярэдзіне гэтага месяца партызаны атрада імені Кутузава зрабілі дзерзкі налёт на варожы гарнізон у вёсцы З. У вулічным баю патрыёты знішчылі нямецкага каменданта, 60 здраднікаў і 8 узялі ў палон. Разбіта станцыя сувязі.

Партызаны захапілі трафеі: 2 мінамёты, 2 кулямёты, 30 вінтовак і больш 3.000 патронаў.

Неўзабаве партызаны гэтага атрада падсцераглі варожы абоз на адной з шасейных дарог. З засады было знішчана 40 канваіраў, а астатнія ўцякаючы патапіліся ў рацэ С. Патрыёты захапілі 45 падвод з рознымі прадуктамі і многа ўзбраення. Без усякіх страт народныя мсціўцы звярнуліся ў сваё распалажэнне.

МІХАІЛ Д.

## Няспынна расцем

З кожным днём у рады народных мсціўцаў уліваецца новае папаўненне. За апошні месяц у атрад імені Фрунзе прышло 42 патрыёты, якія са зброяй у руках уключыліся ў барацьбу з нямецкімі захопнікамі.

М.

## БЯССЛАЎНЫ КАНЕЦ

Сведкай гэтага лютага злadзейства быў натоўп мірных жыхароў, сагнаных на плошчу. Людзі ўкрадкам выціралі слёзы, другія стаялі з акамянелым у жаху позіркам. Прыхілўшыся да слупа шыбеніцы, 16-гадовая дзяўчына ламала пальцы сваіх рук. Горкімі слязамі яна палівала апошнія сляды свайго жыцця. Дзяўчыну прывялі на страшную смерць за тое, што яна працуючы ў шпіталі ўзяла для сябе кавалак бінту.

—Другім не павадна будзе гэта рабіць—сказаў кат Шэрамет і зацягнуў на шыі дзяўчыны пятлю.

—Гады!—У прадсмертнасці прастанала дзяўчына і цела яе павісла ў паветры.

Безліч падобных „подвігаў“ зрабіў агідны забойца Шэрамет.

***

Смага да новага злачынства прабудзілася ў начальніка палітычнага і следчага аддзела абласной паліцыі садыста Шэрамета, калі яму данеслі, што насельніцтва вёскі А. не падпарадкоўваецца нямецкім уладам. „Навесці парадак“ рашыў ён сам. У суправаджэнні намесніка і двух следчых Шэрамет выехаў прадаць пакутлівай смерці новыя дзесяткі савецкіх людзей і ў патоку крыві народнай дабыць сабе новую славу. Яму ўжо мярэшчылася новае багацце ў пакоях свайго двухпавярховага дома, а кроў будзе не 4, а...

Па шасе плаўна каціілася аўтамашына. Для сустрэчы яе ў групы партызан усё было гатова

—Рві, Лёнька!—крыкнуў камандзір групы Нікалай К. Моцна грымнуў тол. Кулямётнымі чаргамі прачэсваюць гарашчую машыну Фёдар М. і Нікалай Б. Леанід М. ужо апынуўся на другім баку дарогі. Перакрэсным агнём хутка ўсё было пакончана.

Смельчакі захапілі 2 аўтаматы, 2 вінтоўкі і пісталет.

Так закончылася „праслаўленне“ Шэрамета з сваімі спутнікамі і памылкова дадзенае ім жыццё. За гвалтаўство над народам прыспешнікі нямецкіх жываглотаў паплаціліся сваёй шкурай. Агонь сарваў яе з іх сабачага цела.

Палынам і чортапалохам зарасце тое месца на зямлі, дзе ёю прысыпаны агідныя целы здраднікаў. Праклянцце будзе ім успамінам!

НІКАЛАЙ П.

РЭДКАЛЕГІЯ